**УДК 94(476.5)**

# ПАХОД НА ПОЛАЦК КААЛІЦЫІ ПАЎДНЁВАРУСКІХ КНЯЗЁЎ У 1127 г. І ЯГО ВЫНІКІ АДНОСНА ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

***М.П. КРУПСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, праф. Д.В. ДУК)***

*Палітычная сітуацыя ва ўзаемаадносінах полацкіх і кіеўскіх князёў змянілася пасля смерці Уладзіміра Манамаха і ўстанаўлення на кіеўскім пасадзе яго сына Мсціслава Уладзіміравіча. Летапісцы не называюць дакладных прычын паходу паўднёварускіх аб'яднаных сіл у Полацкую зямлю ў 1127 г. Сярод даследчыкаў існуюць розныя меркаванні, у тым ліку выносіцца і спроба палачан вярнуць Менскі ўдзел. Полацкія князі заўсёды выкарыстоўвалі барацьбу Кіева на паўднёвых рубяжах для нападу на памежныя ўладанні. Паміма страты Менскай зямлі, палачане памяталі і пра страту вельмі важных ў эканамічным сэнсу падняпроўскіх зямель з Оршай і Копысем, якія таксама адышлі да Кіева па мірнаму дагавору 1119 г.*

Пачатак XII ст., адносна Полацкай зямлі, адкрывае новы этап палітычнага развіцця дзяржавы. У 1101 г. памірае полацкі князь Усяслаў Брачыславіч. Пасля палону, а затым і смерці першага менскага князя Глеба Усяславіча, барацьба нашчадкаў полацкага князя з кіеўскімі Яраславічамі не сканчаецца. Разам з гэтым мы бачым і барацьбу паміж сабой асобных прадстаўнікоў князёў з роду полацкіх Усяславічаў. Але ў гэтую барацьбу былі ўцягнутыя і князі смаленскія з чарнігаўскімі.

У 1119 г. Полацкае княства страчвае Менск. Да ўлады ў Кіеве прыходзіць унук Уладзіміра Манамаха – Ізяслаў Уладзіміравіч, які быў пастаўлены замест зняволенага Глеба Усяславіча. Такім чынам, з улікам існуючых падзей, палітычнае жыццё Менска практычна знікае са старонак летапісаў. Параза для Полацкай зямлі была вельмі балючай. Зразумела, што на гэтым барацьба Кіева і Полацка не скончыцца. Разумеў гэта і сам Уладзімір Манамах, таму ў 1121 г. "былъ съ дѣтьми своими въ Смоленскъ для расмотренія несогласій и умиренія Полоцкихъ князей… [1, с. 223]". Цяжка згадзіцца з думкай Л.В. Аляксеева, які лічыць што выклік полацкіх князёў у Смаленск, з'яўляецца вынікам таго, што пасля 1119 г. уся Полацкая зямля, а не толькі Менскі надзел, была падначалена Кіеву, і Уладзімір Манамах вызваў Полацкіх уладароў, як сваіх васалаў [2, с. 257–258]. Таксама існуе іншая версія, больш праўдападобная, што Манамахавічы спрабавалі вырашыць пытанне ўстанаўлення смаленска-полацкай мяжы. Гэта падцвярджаецца будаўніцтвам шэрага парубежных вёсак-крэпасцей па правым беразе Дняпра ў XII ст. Стражэва, Германы, Ганчарова, Прыволле [3, с. 62], а таксама трэба ўзгадаць з'яўленне Оршы (раней цэнтрам валачан аршанскага Падняпроўя быў пагост у Чэркасава [3, с. 62]). Як сумежнай крэпасці на мяжы са Смаленскім княствам. Афіцыйнае замацаванне за Полацкай зямлёй, па ўзаемнай згодзе з Уладзімірам Манамахам, Аршанскай зямлі было кампенсацыяй за страту ёю тэрыторыі Менскага княства падчас паходу сыноў Манамаха ў 1119 г. Паколькі ў Устаўной грамаце 1136 г. смаленскага князя Расціслава Мсціславіча сярод гарадоў, якія выплачваюць дзесяціну Смаленскай епіскапіі, названа Копысь, то, мабыць, яна па ўмовах перамір'я была вернута Смаленску, як Орша – Полацку [4, с. 109]. Што дазваляе ўспрымаць гэта як вынік перамоў.

Відавочна, что гэтыя дамоўленасці паміж Полацкімі князямі і Манамахавічамі дзейнічалі на працягу ўсяго перыяду праўлення Уладзіміра Манамаха ў Кіеве. Аналізуючы з'езд 1121 г. М.І. Ермаловіч выказвае думку, што сход князёў мог адбыцца не ў Смаленску, а ў Менску [5, с. 173], тлумачачы гэта памылкай у "Аповесці мінулых гадоў", што ўсё ж такі мала верагодна.

Сітуацыя змянілася пасля смерці кіеўскага ўладара і ўстанаўлення на кіеўскім пасадзе яго сына Мсціслава Уладзіміравіча. Летапісцы не называюць дакладных прычын паходу паўднёварускіх аб'яднаных сіл у Полацкую зямлю ў 1127 г. (па Іпацьеўскаму спіску – 1128 г., але больш верагодная дата ўсё ж 1127 г. [6, с. 179]). Сярод даследчыкаў існуюць розныя меркаванні, у тым ліку выносіцца і спроба палачан вярнуць Менскі ўдзел [6, с. 178]. Звесткі пра прычыну вайны знаходзім у В.Н. Тацішчава "Мстиславъ Великій Князь, видя Полоцкихъ Князей великое беспокойство, что области данныя братіямъ и сынамъ его непрестанно нападая разоряютъ…" [1, с. 235].

І гэта зразумела: полацкія князі заўсёды выкарыстоўвалі барацьбу Кіева на паўднёвых рубяжах для нападу на памежныя ўладанні. Паміма страты Менскай зямлі, палачане памяталі і пра страту вельмі важных ў эканамічным сэнсу падняпроўскіх зямель з Оршай і Копысем, якія таксама адышлі да Кіева па мірнаму дагавору 1119 г.

У 1127 г. (мал. 1) вялікі князь кіеўскі Мсціслаў, назіраючы непадпарадкаванне Полацкіх князёў і ў сувязі з тым, што працягваліся напады на падуладныя зямлі кіеўскаму пасаду: "послалъ на нихъ братьевъ своихъ четырьмя пути: Вячеслава изъ Турова, Андрея изъ Владимира, Всеволода изъ Городца,

Изяслава Ярославича изъ Луцка, и повелълъ имъ итти ко Изяславлю; Всеволоду сыну и своему изъ Новограда къ Неключу; Всеволоду Олговичу Черниговскому и братьямъ его на Стрижевъ къ Борисову; съ ними же посталь воеводу своего Ивана Воитишича со Торки; изъ Курска сына своего Изяслава со своимъ полкомъ на Логожескъ, а Ростислава со Смольяны кь Друтску, и повелъль имъ всъмь совокупясь у Борисова, августа 14 дня отправить въ земли Полоцкія войска для разоренія" [1, с. 235; 7, с. 93; 8, с. 193; 9, с. 106]. За дзень да гэтага на Лагойск нечакана нападае Ізяслаў Мсціславіч. Горад значна пацярпеў ад нечаканага ўварвання, было захвачана шмат палонных, лагажане спалохаўшыся такога напору здалі горад. Да гэтага часу Андрэй з Вячаславам падступілі да сцен Ізяслаўля, жыхары горада прынялі бой, і змагаліся мужна. Затрымаўшыся на два дні каля Лагожска (мал. 2), Ізяслаў ўзнае аб супраціўленні Ізяслаўля і накіроўвае свае войскі на падмогу Андрэю і Вячаславу, узяўшы з сабою паланёнага зяця свайго Брачыслава, які ішоў на дапамогу свайму бацьке, і паланёных жыхароў Лагожска. Ізяслаўцы, убачыўшы свайго князя і паланёных лагажан “вь чести содержанныхъ” паслалі да князя Вячаслава паслоў, з просьбай не знішчаць горад пры ўмове дабравольнай здачы горада. Горад быў здан, але князь Вячаслаў не стрымаў дадзенага абяцання і горад быў разрабаваны [10, с. 141]. Затым прыйшоў Усевалад з Ноўгарада да Неключа.



*Схема 5. Коалиционный поход русских князей на Полоцкую землю 1127 г. 1 — южнорусская коалиция; 2— неосуществленная часть похода Ольговичей на Стрежев; 3 — предполагаемое направление удара Ольговичей; 4 — Полоцкая земля*

Мал. 1. Вайна 1127 г. паўднёварускіх князёў супраць Полацкага княства [1, с. 35]



Мал. 2. Войска курскага князя Ізяслава Мсціславіча пад сценамі Лагойска, 1127 г. Мініяцюра Радзівілаўскага летапісу [9]

Увогуле Полацкай зямлі быў нанесены вялізны ўрон, з улікам гэтага, у самім Полацку збіраецца вечавы сход, на якім прымаецца рашэнне аб выгнанні Давыда Усяславіча, а на Полацкі пасад быў запрошаны Рагвалод Барысавіч [1, с. 236; 7, с. 94; 11, с. 319].

Дадзенае рашэнне было матывавана тым, што віноўнікам разрушальнай вайны з'яўляецца Давыд Усяславіч і яго паплечнікі. З такім рашэннем яны адправіліся да Мсціслава, які даў згоду на рашэнне полацкага веча, пасля чаго быў заглючаны мір і Мсціслаў Уладзіміравіч накіраваўся назад у Кіеў.

Па выніках вайны, на гэты раз Полацкая зямля трапляе ў часовую залежнасць ад Кіеўскага стала.

У 1129 г. вялікі князь Мсціслаў Уладзіміравіч пасылае ваявод данесці звесткі да ўсіх падначаленых яму князёў, каб збіралі войска і ішлі да Кіева дзеля сумеснага пахода супраць полаўцаў, у тым ліку і да Усяславічаў. Усе падпарадкаваліcь воле князя, акрамя полацкіх, якія адмовіліся і пры гэтым паставіліся з пагардай "Ты съ Бонакомъ (так называлі палавецкага хана) шолудякомъ здравствуйте оба, и управляйтеся сами, а мы имъемь дома что дъелать" [1, с. 241]. Мсціслаў Уладзіміравіч быў гэтым вельмі абражаны, аднак на той момант здзейснеў паход на полаўцаў. З якога вярнуўся з перамогай. А між тым, Усяславічы працягнулі напады на падуладныя Кіеву землі і пры гэтым не сціхалі міжусобіцы непасрэдна ўнутры Полацкай зямлі. Мсціслаў прымае адзінае вернае рашэнне, наказаць за непадпарадкаванасць: "велъль токмо князей взять на судъ въ Кіевъ предъ братію, а городовь и земли не раззорять, и крови руской не проливать, есть ли токмо за нихъ не вступаться" [1, с. 240]. У сувязі з гэтым "полочане", як піша В.Н. Тацішчаў, маецца на ўвазе полацкае веча, адказаліся пачынаць новую вайну з Кіевам і прымусілі падпарадкавацца рашэнню Мсціслава Уладзіміравіча, паўстаць перад кіеўскім судом: "Воеводы же Мстиславли собравъ ихъ, Давида, Ростислава, Святослава и двухь Рогволодовичевъ (Васілія і Івана, самаго Рагвалода, да гэтага часу, відавочна не было ў жывых [7, с. 94]; але ў А.П. Сапунова ў пералічэнні выгнаных Полацкіх князёў бачым і ўпамінанне самаго Рагвалода [12, с. 409], што трэба паставіць пад сумненне, бо ўлічваем звесткі В.Н. Тацішчава, дзе ўлічваюцца толькі два сыны Рагвалода), "посадя въ три судна съ женами и дътьми, привезли въ Кіевъ, а Мстиславъ облича ихъ пред князи, посадя въ три судна, послалъ къ императору Іоанну зятю своему, чтобы ихъ тамо велъль содержать въ Полоцкъ же Мстиславъ опредълилъ сына своего Изяслава" [1, с. 240–241; 7, с. 94; 13, с. 255].

Трэба адзначыць, што візантыйскі імператар Іаан, да якого прыбылі выгнаннікі, даводзіўся Усяславічам сваяком [14, с. 68–69], таму высылка была ганаровая. Полацкія князі не марнелі ў турмах, а займаліся звыклаю справаю. Імператар Іаан прызначыў іх кіраваць войскам у вайне супраць сарацынаў (арабаў), на якой полацкія князі праявілі сябе мужнымі ваеначальнікамі і заслужылі пахвалу Іаана.

Паход на Полацк кааліцыі паўднёварускіх князей у 1127 г. завяршыўся для Полацка паразай. Па выніках вайны, Полацкая зямля трапляе ў часовую залежнасць ад Кіеўскага стала. 1129 г. кіеўскі князь Мсціслаў Уладзіміравіч высылае ў Візантыю пяцёра патомкаў Усяслава Брачыславіча з сем'ямі, што з'явілася вынікам гэтых падзей.

ЛІТАРАТУРА

1. Татищевъ, В.Н. Исторія Россійская съ самыхъ древнейшихъ временъ неусыпными трудами черезъ тритцать лътъ собранная и описанная покойнымъ тайнымъ совътникомъ и Астраханскимъ губернаторомъ Васильемъ Никитичемъ Татищевымъ. Книга вторая. Напечатана при Императорскомъ университетъ, 1773 г. – 536 с.
2. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля. (Очерки истории Северной Белоруссии). В IX–XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М. : Наука. 1966. – 295 с., ил.
3. Левко, О.Н. Полоцк – центр земли в XI–XIII вв. Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О.Н. Левко [и др.] ; редкол.: А.А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О.Н. Левко / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории. – Минск : Беларус. навука, 2012. – 743 с. : ил. – (Древнейшие города Беларуси).
4. Левко, В.М. Роль Менского княжества в территориально-административном и политическом развитии Полоцкой земли / О.Н. Левко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск, 2013. – Вып. 24 : Даследаванне сярэдневяковых старажытнасцей Цэнтральнай Беларусі (памяці Ю.А. Заяца) [уклад.: В.Л. Лакіза, А.М. Мядзведзеў]. – 382 ; [1] с.
5. Ермаловіч, М.І. Старажытная Беларусь: Полац. і новагард. перыяды / М.І. Ермаловіч ; прадм. М. Ткачова. – 2-е выд. – Мінск : Маст. літ., 2001. – 366 с. : іл.

6. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2007. – Т. 1 : Старажытная Беларусь: Ад першапачатковага засялення да сярэдзіны XIII ст. – 351 с.; іл.
7. Довнар-Запольский, М.В. Очерк истории Кривичской и Дреговичской земель до конца XII столетия / М.В. Довнара-Запольский. – Киев : Типолитогр. Т-ва И.Н. Кушнерев и К в Москве. Киев. отд-ние, 1891. – VI, 170 с.
8. Тарасенко, В.Р. Древний Минск (по письменным источникам и данным археологических раскопок 1945–1951 гг. / В.Р. Тарасенко // Материалы по археологии БССР. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1957. – Т. I. – 279 с.
9. Полное собрание русских летописей. – Ленинград : Наука, 1989. – Т. 38 : Радзивиловская летопись. – 177 с.
10. Леонардов, Д.С. Полоцкій князь Всеславъ и его время. (Продолженіе) / Д.С. Леонардов // Полоцко-Витебская старина / Витебская ученая, архивная комиссія. Типо-Лит. Насл. М.Б. Неймана. – Витебскъ, 1916. – Вып. III. – С. 87–180.
11. Беляев, Д.И. Исторія Полотска, или Съверо-Западной Руси, отъ древнъйшихъ временъ до Люблинской уніит / Д.И. Беляев. – М. : Синодальная Типографія, 1872. – 456 с.
12. Сапунов, А.П. Река Западная Двина. Съ картами, планами и рисунками / сост. и изд. А. Сапуновъ. – Витебскъ : Типо-Литографія Г.А. Малкина, 1893. – 512 с.
13. Книга Степенная царского родословія, содержащая исторію Россійскую съ начала оныя до временъ государя царя и великаго князя Іоанна Васильевича, сочиненная трудами Преосвященныхъ Митрополитовъ Кипріана и Макарія, А напечатанная подъ смотръніемъ Коллежскаго Совътника, Императорской Академіи наукъ; такожъ и разныхъ Иностранныхъ Академій, и Вольнаго Екаsuccumbномическаго и Россійскаго Вольнаго же Собранія Члена Герарда Фредерика Миллера. – Часть I. – Вь Москвъ, При Императорскомъ Университетъ. – 1775 г. – 580 с.
14. Арлоў, У.А. Таямніцы полацкай гісторыі / У.А. Арлоў. – Мінск : Беларусь, 1994. – 463 с. : іл.